Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес —2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей,, хто ня захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія тэлькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакдае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. — 1 Жніуня 1914 г. — № 30

**Прымаецца далей подпіска на „Нашу Ніву“ на 1914 г.**

Цэна на год—2 р. 50 коп., на 6 мес.—1 р. 25 к., на 3 мес.— 65 к., на 1 мес.—25 кап.

*Адрэс: Вільня, Віленская 29.*

## НАЙВЫШЭЙШЫ МАНІФЭСТ.

БОЖАЙ МІЛАСЬЦЮ

### Мы, Мікалай Другі,

Імпэратор і Самодзержэц Усерасейскі,

Цар Польскі, Вялікі Князь Фінляндзкі і прочая і прочая і прочая.

Ведамо чынім усім нашым верным падданым.

Колькі дзён таму Нашым Маніфэстам паведамілі Мы расейскі народ аб вайне, каторую Нам апавесьцілі Немцы. Цяпер Аўстро Вэнгрыя, першая зачыншчыца сьветавой завірухі, абнажыўшая меч ў час глыбокага супакою проці слабейшай Сэрбіі, скінула с сябе маску і апавесьціла вайну Расеі, каторая не раз яе ратавала. Сілы ворага растуць проці Расеі і усей славяншчыны, уваружыліся абедзві дужые дзержавы нямецкіе. Але с падвоенай сілай расце проці іх справядлівы гнеў спакойных народоў, і з нязломнай цьвердасцю устае перад ворагам вызваная на вайну Расея, верная слаўным перэказам сваей мінуйшчыны. Бачыць Бог, што не дзеля ваенных замыслоў ці марнай сьвецкай славы паднялі Мы аружжэ, але, бароню чы дастойнасці і баспечнасці сцеражонай Богам Нашай Імпэрыі, змагаемся за чэсную справу. У цяперэшняй вайне народоў мы не адны. Разам з намі паўсталі слаўные хаўрусьнікі нашы, каторые гэтак сама прымушэны хапіцца сілы аружжа, каб спыніць нанец вечную гразу са стараны нямецкіх дзержаў агульнаму міру і спакойнасці.

Ніхай Усёмагучы Бог благаславіць аружжу Нашаму і Нашых хаўрусьнікоў і ніхай падыймецца ўся Расея на геройскі чын з зялезам у руках, с крыжам у сэрцы.

Дан у С.-Пецярбурзе дня дваццаць шэстого ліпня у лето ад Раджэньня Хрыстова 1914-ое царствованьня жэ Нашаго у дваццатое.

На подлінніку Уласнай Яго Імпэратарскаго Велічэства рукою падпісано:

„МІКАЛАЙ“.

## Надзвычайнае заседаньне Думы і Савета.

Цяперашнім часам у вайне перэважывае той, хто мае болей грошы, каму ня лішне також паваеваць месяц, два, ці тры, ато і поўгоду.

С гэтай прычыны, пасьля таго, як проці Расеі паднялі вайну немцы і аўстрыйцы, расейскі урад перш-на-перш пачаў клапаціцца аб тым, каб забеспечыць сабе патрэбные на вайну грошы. I вось 26 ліпня гэтаго году Государ склікаў на надзвычайнае заседаньне Гасударственную Думу і Савет.

Урад падаў дэпутатам некольні праектоў, як забеспечыць сабе грошы на вайну. Праекты гэтые былі вось якіе: выпусьціць чым больш паперовых грошы («бумажэк»); спыніць на два месяцы сысканьне грошы з даўжнікоў, калі вэксэлі выданы не пазьней як 17 ліпня («мораторіум»); урэшці, завясьці вялікшые налогі на віно, піво і тутун. З гэтаго зьбяруцца немалые грошы, каторых павінна хапіць на вайну.

На заседаньні Думы, бадай усе дэпутаты «інородцы» цьвёрда паказалі сваю прыхільнасць да Расеі: яны пачалі адзін перад адным тлумачыць, што яны сваей бацькаўшчынай лічаць Расею і гатовы аддаць усё, каб супольне з расейскім народом спыніць паход немцоў. Да іх прылучылася і оппозыція. I калі міністэрствы падалі свае праекты на прагляд Думы, дэпутаты з усіх партій без ніякой гутаркі зацьвярдзілі іх.

Пасля гэтаго—ў той же дзень—Думу, дый Савет, у каторым адбылося усё тое, што і ў Думе, распусьцілі да 1-го лютаго 1915 году, ды перад раз'ездам дэпутатоў было сказана, што ў патрэбі ізноў мо' склічуць іх перад назначэным тэрмінам.

Адным словам, грашэвая справа ў Расеі пастаўлена добра, — і гэта шмат паддзержывае сілы дзержавы ў яе вайне з Немеччынай і Аўстрыей.

## НА ВАЙНЕ.

Кожын дзень цяпер прыносіць с сабой нешта новае. Ешчэ у апошнім нумэры «Нашай Нівы»—ўсяго сем дзён таму назад—пісалі мы аб вайне між Аўстрыей і Сэрбіей, праз каторую узнялася вайна між Нямеччыной—з аднаго боку, Расіей і Франціей--з другога. А цяпер, калі пішуцца гэтые словы, у Эўропі йдзе ўжо сем войн: Нямеччына ваюе з Расеей, Франціей і Бэльгіей, Аўстрыя—с Сэрбіей, Расеей і Франціей, Англія урэшці аб'явіла вайну немцам,— ды гэтак усе у кружок б'юцца. I трэба спадзевайца, што йшчэ іншые дзержавы ўмешаюцца ў вайну, гэтак пачынаецца ўжо сварка між Аўстрыей і Італіей, дый балканскіе дзержавы бадай, ня будуць сядзець ціцком...

Ўсе ваююць. Але сілы ў іх—няроўные. З аднаго боку стаіць Нямеччына і Аўстрыя, з другога —Расея, Франція, Англія, Бэльгія. Хто каго перасіліць?

Трэба сказаць, што ужо с першых крокоў немцам не пашанцавала. Яны думалі, што Бэльгія, невялікі край між Нямеччынай і Франціей, пазволіць нямецкай арміі свабодна прайсьці праз сваю зямлю: гэта для немцоў было дужа патрэбна, бо праз Бэльгію найлягчэй папасьці у Францію. Ажно выйшла ня тое: бэльгійцы супраціўіліся немцам і каля крэпасьці Льеж дзержаць іх ужо некольні дзён, непускаючы ўпярод — да Франціі. I хаця самы горад Льеж немцы ўзялі ў той чэцьверг, хаця страцілі пры гэтым каля 20000 душ салдат, усёж такі форты—самая Льежская крэпасць--ешчэ дзержацца і ня хочуць паддацца. Немцам німа як ісьці далей, пакуль з-заду ёсць непрыяцельская крэпасць Поруч з гэтым на падмогу бэльгійцам ідуць французы і англічане (англійскаго войска прыехала праз морэ каля 200000 душ). Дык і нямецкі паход стануў на мейсцу—і ні ўзад, ні ўперад. А тут ешчэ французы ўскочылі ў нямецк'е правінціі Эльзас і Лотарынгію, каторые калісьці належалі да Франціі і цяпер з усяе душы жадаюць вярнуцца да старой бацькаўшчыны, ды шчыра вітаюць французоў. Адным словам, на захадзі немцам не шанцуе.

Паглядзімо цяпер, што робіцца на Ўсходзі,–значыць, на расейскай граніцы. Тутака—ўздоўж усяе граніцы—ад Балційскаго мора да Польшы і далей ўздоўж гольскай граніцы на палудзень ажчо да Віслы рэкі—раскінулася нямецкая армія, даходзячы да граніц Аўстры. На граніцы з Літвой, што да нас найбліжэй, дагэтуль немцам нічога зрабіць не удалося: толькі невялічкіе каманды перэхадзілі праз граніцу на наш бок, ды адну з іх расейцы разьбілі каля пагранічнаго гораду Вержбалова: згінула там немцоў больш сотні душ, у расейцоў жэ—60. За тое немцы прайшлі глыбей з захаду на ўсход у Польшчу: яны забралі некольні мест, каторых ніхто не бараніў (Каліш, Чэнстохова, Бэндзін). С поўдня ім на падмогу йдуць аўстрыякі, каторые захапілі горад Ендржэев (у Келецкай губэрні),—і ўсе разам, як відаць, кірующца пад Варшаву.

Аўстрыя, аб'явіўшы Расеі вайну сьледам за Немеччынай, зразу жэ папхнула сваю армію на Валынь і Падольле. Некольні аўстрыйскіх каманд перайшлі Расейскую граніцу каля Радзівіллова, Волочыск і на поўдні — каля граніцы з Румыніей,—і ўжо на нашым баку ідуць невялічкіе бітвы, а ў суботу, 29 ліпня, каля мястэчка Бэрэстэчко, дзе калісьто шло змаганьне між казакамі і палякамі (недялёка ад Почаёва), зышлося расейскае і аўстрыйскае войска. Переважылі расейцы: пасьля нядоўгай бітвы, аўстрыйцы атступіліся назад—да сваей граніцы, ды па дарозі спалілі гарадок Броды. Народу згінула пры гэтым не шмат: у аўстрыйцой забітых і раненых усяго колькідзесят душ.

Як бачым, вялікай бітвы дагэтуль на расейскай граніцы не было. Газэты тлумачаць гэта тым, што немцы толькі тры--чатыры дні таму назад павінны былі скончыць мобілізацію, ды толькі цяпер пачнецца праўдзівая вайна.

Гэтак на сухапуцьці. На моры так сама йшчэ даволі спакойна. На Балційскім моры ля берагоў Расеі круцяцца немецкіе броненосцы. Яны намыкаліся абстрэліваць горад Лібаву і пусьцілі ў яго каля 20 бомб, не зрабіўшы вялікай шкоды. У газэтах ходзяць чуткі, бытцым немцы маняцца плыць з войскам у Ганге—(па беразі Фінляндіі) ды тамака высадзіць сваю армію, але дагэтуль нічога аб тым не чутно. Не чутно, чым скончылася марская бітва між нямецкім і англійскім флотам, што узнялася колькі дзён таму назад на Нямецкім моры (каля берегоў Шотландіі): англійскі флот дужэйшы за нямецкі, і бадай што немцам гэта бітва нічога добраго не прынясець.

Пакуль ваюючые арміі стаяць адна проці аднэй, ачглічане кінуліся ў іншы бок. Немцы маюць у розных часьцях сьвету—у Афрыцы, Азіі і др. багата колоній, куды вязуць на прадажу свае тавары і добра на гэтым зарабляюць. Вось, англійскі флот перэймае нямецкіе гандлёвые караблі і гэтак спыняе нямецкі гандэль с колоніямі, а самые колоніі Англія памаленьку забірае у свае рукі.

Гэтак немцам і іх хаўруснікам аўстрыйцам вайна ня суліць нічога добраго. Ды у Нямеччыне спадзяюцца хатняй вайны: імпэратар Вільгэльм II прыказаў арэштаваць глаўнаго нямецкаго соціаліста Лібкнэхта ды разстрэляць яго, а так сама арэштаваў цэнтральны камітэт соціал-дэмакратоў і іх кассу. А як соціалістоў у Нямеччыне—больш мільёна, дык німа ведама, ці захочуць яны ціха сядзець і ці не пачнецца тамака завіруха. Ужо у Бэрліне адбываюцца демонстраціі проці імпэратара і насьледніка, каторых вінаваццяць у гэтай сусьветнай вайне.

Чым усё скончыцца, нет ведама. Адно можна сказаць, што вайна доўга не пацягнецца: лішне многа ахвяр забярэ яна, лішне многа грошы трэба на тое, каб прахарчэваць мільённые арміі.

## ВАЙНА.

### Руско-Аустрыяцкая.

24 ліпня а 6¼ гадзіне вечэра Аўстрыя аб'явіла вайну Расеі.

А шостай гадзіне раніцы, за 12 гадзін да аб'яўленьня нам вайны, Аўстрыякі каля Волочыска стрэлялі з ружжаў у нашых часавых, узарвалі шпалы і апоры жэлезнадарожнаго мосту цераз пагранічную рэку Збруч, але граніцы не перайшлі. Каля Тарноруга, Цэхацова і Сатанова пачалася ружэйная перастрэлка; нашы раз'езды, падходзіўшые к Сольдау, былі абстрэліваны з гармат. Станція Іллаво і Наржым спалены.

Глаўны штаб маець весткі, што аўстрыякі усілена вядуць войска у Галіцію.

Паведамляюць, што блізка Ру-

